**ПАЛАЖЭННЕ**
аб V Абласным адкрытым
конкурсе юных кампазітараў

**1.** Арганізатарамі V Абласнога адкрытага конкурсу юных кампазітараў (далей – конкурс) з'яўляюцца Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт і ўстанова адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы".

**2.** Асноўнымі мэтамі конкурсу з'яўляюцца:
- падтрымка таленавітых маладых музыкантаў (навучэнцаў устаноў адукацыі), развіццё іх творчых здольнасцей і павышэнне прафесійнага ўзроўню;
- папулярызацыя музычнага мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь і Брэсцкай вобласці ў прыватнасці;
- захаванне традыцый і пошук новых шляхоў развіцця нацыянальнай кампазітарскай школы.

**3.** У конкурсе могуць браць удзел навучэнцы ДШМ, ДМШ і ўстаноў адукацыі сістэмы Міністэрства адукацыі (далей – канкурсанты).

**4.** Для непасрэднага кіравання правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт).

**5.** Аргкамітэт:
- ажыццяўляе кіраванне падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу;
- разглядае і зацвярджае склад журы конкурсу;
- узаемадзейнічае з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці і іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення і асвятлення конкурсу ў сродках масавай інфармацыі;
- вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

**6.** Пасяджэнні аргкамітэту лічацца правамоцнымі, калі ў іх бярэ ўдзел не менш за дзве трэці яго складу. Рашэнне аргкамітэту афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня аргкамітэту.

**7.** Умовы правядзення конкурсу:
7.1. Форма ўдзелу - **дыстанцыйная**.

**7.1.** Конкурс праводзіцца ў намінацыі "Кампазітарскае мастацтва" па трох узроставых групах:
- малодшая група - да 10 гадоў уключна;
- сярэдняя група - 11-13 гадоў уключна;

- старэйшая група - 14-16 гадоў уключна.

Узрост удзельнікаў вызначаецца на дату правядзення конкурсу.

**7.2.** Праграмныя патрабаванні:

Конкурсная праграма ўдзельніка павінна складацца з 2-х твораў, адзін з якіх з'яўляецца абавязковым і прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі або 85-годдзю Брэсцкага музычнага каледжа імя Рыгора Шырмы.

Калі твор сольны, яго павінен выканаць аўтар; калі напісаны для ансамбля, аўтар таксама павінен прыняць у яго выкананні непасрэдны ўдзел (як саліст, канцэртмайстар ці ўдзельнік ансамбля).

Працягласць выступлення ўдзельнікаў:

- малодшая група - да 8 хвілін гучання;
- сярэдняя група - да 12 хвілін гучання;
- старэйшая група - да 15 хвілін гучання.

У конкурснай праграме выконваюцца творы, якія раней не былі прадстаўлены на іншых конкурсах і не былі надрукаваныя.

**7.3.** Для ўдзелу ў конкурсе канкурсант альбо ўстанова адукацыі, у якой ён навучаецца, да 12 мая ўключна на адрас gelement@list.ru накіроўвае наступныя матэрыялы:

- запоўненую электронную форму заяўкі;
- копію дакумента, які сведчыць асобу (пашпарт або пасведчанне аб нараджэнні);
- нотны тэкст выкананых твораў у фармаце *.pdf або *.jpeg (нотныя тэксты могуць быць напісаны акуратна і разборліва «ад рукі» або набраныя ў нотным рэдактары);
- спасылку на відэазапіс выканання конкурснай праграмы.

7.4. Подача заявки на участие в конкурсе свидетельствует:

✔ о полном согласии законных представителей конкурсанта с условиями конкурса;
✔ о том, что использование в конкурсе видеозаписей исполнений участников не будет нарушать прав законных интересов третьих лиц;
✔ о том, что даёт согласие на обработку персональных данных в соответствии со ст. 5 Закона РБ от 7 мая 2021 года № 99-З «О защите персональных данных»

**7.4.** Заяўкі і матэрыялы на ўдзел у конкурсе прымаюцца да 10 мая 2025 года (Дадатак 1). Пытанні на конт заяўкі і ўдзелу ў конкурсе па кантактных тэлефонах:
+375295605105; +375297704329.

**7.5.** Уступны ўзнос адсутнічае.

**7.6.** Конкурс праводзіцца ў адзін тур 17 мая. Інфармацыя аб выніках конкурсу будзе размешчана на сайце каледжа 19 мая.

**8.** Для прафесійнай ацэнкі канкурсантаў аргкамітэт зацвярджае склад членаў журы конкурсу (далей – журы) у колькасці не больш за пяць чалавек. Журы складаецца з вядомых беларускіх музыкантаў (педагагічных работнікаў навучальных устаноў у сферы музычнага мастацтва і творчых дзеячаў).

**9.** Журы:

- ацэньвае прафесійны і творчы ўзровень выканання канкурсантаў;
- афармляе пратаколы вынікаў галасавання;
- выбірае прызёраў і дыпламантаў конкурсу, уладальнікаў спецыяльных прэмій і ўзнагарод у кожнай з катэгорый і ўзроставых груп конкурсу і прадстаўляе іх спіс у аргкамітэт для ўзнагароджання;
- інфармуе канкурсантаў аб выніках іх удзелу ў конкурсе;

**10.** Журы ацэньвае канкурсантаў па наступных крытэрыях:

- узровень кампазітарскага майстэрства;
- адметнасць творчай індывідуальнасці асобы;
- навізна і дакладнасць выканання стылістычных асаблівасцяў твораў.

**11.** Размеркаванне прызавых месцаў і спецыяльных прызоў адбываецца шляхам галасавання ўсіх членаў журы. У выпадку, калі ў конкурсе прымае ўдзел вучань альбо сваяк члена журы, дадзены член журы абавязаны адмовіцца ад судзейства ў той узроставай групе, дзе бярэ ўдзел яго вучань (сваяк).

**12.** Пераможцы конкурсу ва ўсіх узроставых групах кожнай катэгорыі атрымліваюць дыпломы I, II і III ступені з прысваеннем звання Лаўрэата конкурсу. Журы мае права прызначыць Гран-пры аднаму з уладальнікаў першай прэміі ў любой узроставай групе, паказаўшаму выбітныя прафесійныя і творчыя здольнасці.

**13.** Журы мае права дзяліць прэміі (выключаючы першую), ці не ўручаць якой-небудзь прэміі. Максімальная колькасць прэмій (лаўрэацкіх месцаў):

- тры – у малодшай групе;
- тры – у сярэдняй групе;
- тры – у старэйшай групе.

Па рашэнню журы асобным канкурсантам могуць быць прысуджаны спецыяльныя прэміі.

Усе рашэнні журы канчатковыя і не могуць быць аспрэчаны.

**14.** Канкурсанты, якія паказалі добрыя, але недастатковыя для дасягнення прызавых месцаў вынікі, атрымліваюць ганаровыя граматы.

**15.** Педагогі лаўрэатаў атрымліваюць ганаровыя граматы конкурсу.

**16.** Кантакты конкурсу:

Электронная пошта: gelement@list.ru

Тэлефоны: +375295605105 (Манько Ганна Уладзіміраўна); +375297704329 (Валасевіч Марына Пятроўна).

Вэб-сайт: mus.brest.by

Фізічны адрас: установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж

імя Рыгора Шырмы", вул. Гогаля, 7, 224030, г .Брэст.

Дадатак 1

ЗАЯВКА
на участие в V Областном открытом конкурсе юных композиторов

1. Фамилия, собственное имя, отчество (если такое имеется) участника
________________________________________________________________
________________________________________________________________

2. Дата рождения, полный возраст
________________________________________

3. Возрастная группа (младшая группа – до 10 лет вкл.; средняя группа - 11-13 лет вкл.; старшая группа – 14-16 лет вкл.) ____________________________________________

4. Место учёбы____________________________________________________
________________________________________________________________

5. Учитель (фамилия, собственное имя, отчество (если такое имеется), телефон, адрес электронной почты) ____________________________________
________________________________________________________________
________________________________________________________________
________________________________________________________________

6. Конкурсная программа:
   6.1.Название обязательного произведения____________________________
________________________________________________________________
________________________________________________________________
   6.2.Название произведения:
________________________________________________________________
________________________________________________________________
________________________________________________________________

7. Согласие на обработку персональных данных.
Я,____________________________________________________________
(ФИО законного представителя участника)
согласен (-а, -ен) на публикацию фамилии, собственного имени, отчества (если таковое имеется), даты рождения, нот и видеоматериалов во всех средствах массовой информации.

____________________________
(подпись законных представителей участника)

| | | |
|---|---|---|
| Руководитель учебного заведения | ________________<br>(подпись) | ____________________<br>(расшифровка подпись) |